Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 25. Варыянт 6**

## Білет 25. Практычнае заданне. Усходнія славяне на тэрыторыі Беларусі: рассяленне, асноўныя заняткі, племянныя княствы, кіраванне імі

**Распрацоўнікі заданняў:**
-Мішына Рыта Іванаўна, ДУА «Забродская сярэдняя школа» Шклоўскага раёна
- Сяркова Алеся Пятроўна, ДУА «Сярэдняя школа № 1 г.Шклова»

**На аснове прадстаўленых матэрыялаў адкажыце на пытанні:**

1. З апорай на крыніцу 1 назавіце ўсходнеславянскія плямёны, якія рассяліліся на тэрыторыі Беларусі. Тэрыторыі якіх сучасных абласцей Беларусі яны займалі ў старажытнасці?
2. З апорай на крыніцу 2 вызначыце гаспадарчыя заняткі і дадатковыя промыслы, якія былі распаўсюджаны ва ўсходніх славян у VI - VIII стст.
3. З апорай на крыніцу 2 назавіце, якія рэлігійныя ўяўленні існавалі ва ўсходніх славян. Якія асаблівасці паганскіх уяўленняў на беларускіх землях вы ведаеце?
4. З апорай на крыніцу 3 дакажыце, што наяўнасць князя і дружыны ва ўсходнеславянскім грамадстве сведчыла аб зараджэнні дзяржавы.

**Крыніца 1**




Усходнеславянскія саюзы плямёнаў і іх суседзі

**Крыніца 2**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Звесткі аб славянах з твора фарсі гісторык Гардзізі.**

Краіна славян роўная і лясістая, і яны ў ёй жывуць. Гэта вялікая краіна, і ў ёй вельмі шмат дрэў, якія растуць блізка адна ад адной. І яны жывуць паміж гэтымі дрэвамі... У іх няма іншых пасеваў, акрамя проса, і няма вінаграду, але вельмі многа мёду... Яны маюць statкі свіней... Яны носяць высокія боты і кашулі да шчыкалатак. Адзенне іх большай часткай з лёну... Рабочай жывёлы ў іх зусім няшмат, а коней няма ні ў кога, акрамя цара... Зімой яны жывуць у хацінах і зямлянках... Калі памірае ў іх хто-небудзь, труп яго спальваюць... На другі дзень пасля спалення нябожчыка яны ідуць на месца, дзе гэта адбывалася, збіраюць попел з таго месца і кладуць яго на груд... І ўсе яны пакланяюцца агню і шануюць быка... Зброя, якой яны валодаюць,– дроцікі, шчыты, стрэлы і дзіды… У іх шмат рабоў. Калі схопяць злыдня, забіраюць яго маёмасць, а яго самога потым караюць…

**Крыніца 3**



Паднашэньне даніны князю.



Дружына ў паходзе

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Адказы:

1. На тэрыторыі Беларусі рассяліліся плямёны крывічоў-палачан, радзімічаў. Дрыгавічаў. Яны займалі тэрыторыі сучасных Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай абласцей.

2. Асноўныя заняткі славян: земляробства, жывёлагадоўля, рамяство, бортніцтва.

3. Славяне-язычнікі пачыталі мноства багоў («І ўсе яны пакланяюцца агню і пачытаюць быка…»). Галоўным богам лічыўся Пярун - бог навальніцы, грому і маланкі. Славяне пачыталі Велеса (апякатар жывёлагадоўлі), Сварога (бог агню і сонца), Дажбога, Хорса і г. д. Асаблівую ўвагу славяне надавалі пахавальнаму абраду. Нябожчыкаў спальвалі і хавалі ў курганах («Калі памірае ў іх хто-небудзь, труп яго спальваюць… На другі дзень пасля спалення нябожчыка яны ідуць на месца, дзе гэта адбывалася, збіраюць попел з таго месца і кладуць яго на груд…»). Пахавальны абрад усходніх славян складаўся з трапезы і трызны - своеасаблівых ваенных гульняў або спартыўных спаборніцтваў у гонар нябожчыка.

4. Усходнеславянскае грамадства развівалася ў напрамку ад племянных княжанняў да стварэння больш магутнай палітычнай арганізацыі – дзяржаве, ключавымі элементамі якой былі вярхоўная княжая ўлада і дружына. Толькі так грамадства магло забяспечыць стабільнае жыццё ўсіх яго прадстаўнікоў. Племянныя княжанні з наяўнасцю князя і дружыны сталі прамежкавай стадыяй паміж саюзам плямёнаў і дзяржавай.